# ВОДЗЫЎ

навуковага кіраўніка па дысертацыі Жука Васілія Ігаравіча «Альфакторны кантынуум беларускай і англійскай моў: на матэрыяле другасных намінацый», прадстаўленай на саісканне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.02.20 – параўнальна-гістарычнае, тыпалагічнае і супастаўляльнае мовазнаўства

Навуковая дзейнасць Жука Васілія Ігаравіча звязана з даследаваннем другасных намінацый, якія ўтвараюцца ў выніку семантычнай дэрывацыі. Увага даследчыка канцэнтруецца на другасных альфакторных найменнях, зафіксаваных перш за ўсё ў ад'ектыўнай лексіцы. Субстантыўныя і дзеяслоўныя лексічныя адзінкі прыцягваюцца з мэтай прадэманстраваць асіметрычны характар альфакторнага корпуса, у якім перавага аддаецца квалітатывам. Да ліку асноўных задач работы адносяцца ўстанаўленне спецыфікі семантычнай дэрывацыі ў ад'ектыўных, субстантыўных і дзеяслоўных намінацыях беларускай і англійскай моў, правядзенне іх семантычнай класіфікацыі, выяўленне тыпалагічнага падабенства і нацыянальна-культурных адрозненняў у рэпрэзентацыі такіх найменняў у дзвюх мовах. У адпаведнасці з мэтай і задачамі даследавання структуруецца тэкст дысертацыі, якая традыцыйна складаецца з агульнай характарыстыкі, трох глаў, заключэння, спіса выкарыстаных крыніц і дадаткаў. У першай главе разглядаюцца пытанні, звязаныя з катэгорыяй альфакторнасці, якая адлюстроўвае найбольш важныя для існасці чалавека характарыстыкі. Другая глава (найбольш аб'ёмная) прысвечана другасным альфакторным лексіка-семантычным варыянтам, якія выяўляюцца ў сэнсавых структурах ад'ектываў (каля 230 беларускіх прыметнікаў, больш за 300 англійскіх ад'ектываў) і субстантываў (23 беларускія субстантывы і 17 англійскіх субстантываў). У трэцяй главе разглядаюцца дзеяслоўныя намінацыі беларускай і англійскай моў.

Дысертацыя В. І. Жука носіць характар завершанага, комплекснага, аргументаванага даследавання важнай лінгвістычнай праблемы. Актуальнасць дысертацыі абумоўлена адсутнасцю спецыяльных даследаванняў, прысвечаных вывучэнню прычын, механізмаў, спосабаў утварэння адарычных лексічных адзінак. Да гэтага часу не ўстаноўлены поўны корпус альфакторных намінацый, адсутнічаюць працы па супастаўляльным даследаванні такіх намінацый у розных мовах. Актуальным неабходна лічыць прыналежнасць работы да перспектыўнага ў сучасным мовазнаўстве кірунку – кантрастыўнай лінгвістыкі, агульны кагнітыўна-камунікатыўны ракурс даследавання і антрапацэнтрычны падыход пры інтэрпрэтацыі фактычнага матэрыялу.

Навуковая навізна дысертацыі В. І. Жука заключаецца ў арыгінальнай пастаноўцы і вырашэнні складаных пытанняў семантычнай дэрывацыі як асноўнага спосабу ўтварэння другасных лексіка-семантычных варыянтаў. Новай з'яўляецца распрацаваная метадалогія класіфікацыі другасных

намінацый і выўленне прамых і абарачальных семантычных мадэлей. Арыгінальнасць і навізна даследавання заключаецца ў падыходзе да класіфікацыі другасных альфакторных ЛСВ: У адпаведнасці з гэтым устаноўлены семантычныя мадэлі ўтварэння другасных альфакторных ЛСВ у трох лексіка-граматычных разрадах слоў (ад'ектывах, субстантывах і дзеясловах). У дысертацыі ўпершыню ўстаноўлены спецыфічныя для кожнай мовы тыпалагічныя мадэлі семантычнай дэрывацыі, якія ў працэсе параўнання выявілі карэлятыўныя пары альфакторных намінацый з адносінамі семантычнага супадзення, частковай эквівалентнасці і безэквівалентнасці.

Аўтар выразна ўсведамляе, што для вялізнай колькасці наяўных у аб'ектыўнай рэальнасці пахаў існуе невялікая колькасць афіцыйных узуальных намінацый і па гэтай прычыне звяртаецца да нацыянальных карпусоў беларускай і англійскай моў (Беларускага N-корпуса, British National Corpus), твораў мастацкай і публіцыстычнай літаратуры. Такі тэкстацэнтрычны падыход дазволіў В. І. Жуку выявіць спецыфіку сінтагматычных адносін і характар спалучальнасці розных лексічных адзінак, у выніку чаго ўтвараюцца аказіянальныя, індывідуальна-аўтарскія другасныя ЛСВ, якія значна папоўнілі альфакторны кантынуум дзвюх моў.

Важнай задачай даследчыка стала не толькі выяўленне аказіянальных і узуальных альфакторных ЛСВ, але і ступень іх уключанасці ў працэс семантычнай дэрывацыі і ўстанаўленне тэматычных блокаў, якія дэманструюць цесную сувязь пахавых ЛСВ з іншымі сэнсарнымі сферамі. Вывучэнне альфакторных намінацый розных мадальнасцей дазваляе праліць святло на агульныя тэарэтычныя праблемы мовазнаўства. У сувязі з тым, што нюхальная сістэма не мае прадстаўніцтва ў кары галаўнога мозгу, успрыманне пахаў нярэдка ажыццяўляецца сінкрэтычна, праз выкарыстанне асацыяцый з іншымі мадальнасцямі (глядзельнымі, смакавымі, тактыльнымі). Таму моўнае апісанне розных пахаў пры дапамозе адчуванняў іншых мадальнасцей выступае як вынік глыбокіх псіхафізіялагічных сінестэтычных сувязей паміж нюхам і іншымі сферамі адчувальнасці. Гэта знайшло адлюстраванне ў семантычных мадэлях тыпу «смак – пах», «дакрананне – пах», «зрок – пах» і інш.

Абраны дысертантам супастаўляльны аспект даследавання дазваляе ўбачыць як агульныя для дзвюх моў заканамернасці, так і спецыфічныя рысы альфакторных намінацый, абумоўленыя розніцай культурных, нацыянальна-гістарычных і рэлігійных уяўленняў носьбітаў розных моў, асаблівасцямі іх светабачання і светаразумення, адрозненнямі саміх моў, у якіх універсальныя семантычныя працэсы і агульныя мадэлі накладваюцца на структурна-сістэмную арганізацыю кожнай канкрэтнай мовы.

Практычная значнасць вынікаў даследавання вызначаецца магчымасцю іх выкарыстання ў галіне навуковых пошукаў пры далейшай распрацоўцы праблем лінгвістычнай тыпалогіі, функцыянальнай граматыцы, а таксама ў лексікаграфічнай і перакладчыцкай практыцы. Матэрыялы даследавання могуць выкарыстоўвацца ў практыцы выкладання беларускай і англійскай

моў, пры правядзенні спецкурсаў і спецсемінараў, напісанні дыпломных і магістарскіх работ, а таксама пры стварэнні вучэбна-метадычных дапаможнікаў па кампаратыўнай лінгвістыцы, тэорыі і практыцы перакладу.

Аспірант В. І. Жук вядзе плённую публікацыйную дзейнасць. Асноўныя вынікі праведзенага дысертацыйнага даследавання адлюстраваны ў 12 публікацыях, сярод якіх 5 артыкулаў у навуковых выданнях, якія ўваходзяць у пералік выданняў, рэкамендаваных ВАК Рэспублікі Беларусь.

Высокая якасць працы шмат у чым абумоўлена асобай саіскальніка. У перыяд работы над дысертацыяй В.І. Жук зарэкамендаваў сябе як граматны, мэтанакіраваны аспірант, які ўмее сфармуляваць навуковыя задачы і вызначаць аптымальныя спосабы іх рашэння, інтэрпрэтаваць вынікі, весці самастойны пошук, паслядоўна аналізаваць матэрыял, працаваць з навуковай літаратурай і выходзіць на ўзровень тэарэтычных абагульненняў

В. І. Жуку ўласціва ўменне эфектыўна планаваць і арганізоўваць сваю работу. Заняткі па англійскай мове ён праводзіць на высокім навукова-метадычным узроўні з выкарыстаннем перадавога педагагічнага вопыту, сучасных інавацыйна-адукацыйных тэхналогій. В. І. Жук прымае ўдзел у сацыяльна-грамадскім жыцці калектыва, з'яўляецца адным з арганізатараў шматлікіх мерапрыемстваў. Адказвае за інфармацыйнае суправаджэнне, з'яўляецца каардынатарам мультымедыйнага асяроддзя на філалагічным факультэце.

Падрыхтаваная дысертацыя В. І. Жука «Альфакторны кантынуум беларускай і англійскай моў: на матэрыяле другасных намінацый» з'яўляецца поўнасцю завершанай навукова-даследчай работай і адпавядае ўстаноўленым патрабаванням ВАК Рэспублікі Беларусь, якія прад'яўляюцца да такіх работ. Навуковая і навукова-педагагічная дзейнасць В.І. Жука дазваляе прысудзіць яму вучоную ступень кандыдата філалагічных навук за новыя навукова абгрунтаваныя вынікі, выкарыстанне якіх будзе садзейнічаць далейшай распрацоўцы тэарэтычных і практычных пытанняў семасіялогіі, семантычнай дэрывацыі, кампаратывістыкі, лексікаграфіі:

- выяўленне найбольш поўнага корпуса альфактoрых ад'ектыўных, субстантыўных і дзеяслоўных намінацый (звыш 640 лексічных адзінак), іх сістэматызацыю і стварэнне на гэтай аснове першага ў лексікаграфічнай практыцы «Беларуска-англійскага тлумачальнага слоўніка другасных альфакторных намінацый»;

- устанаўленне 16 тэматычных блокаў, кампаненты якія з'явіліся крыніцай матывацыі для ўтварэння другасных альфакторных ЛСВ ад'ектываў беларускай і англійскай моў;

- выяўленне структурна-семантычных мадэлей $A_1 \rightarrow A_2$, $N \rightarrow A$, $A \rightarrow N$ субстантыўных і дзеяслоўных адзінак і спецыфікі праецыравання першасных ЛСВ на другасныя ЛСВ неальфакторнай сферы;

- класіфікацыю альфакторных ЛСВ паводле іх прыналежнасці да пеяратыўнай ці меліяратыўнай разнавіднасцей канатацыі;

- устанаўленне аказіянальных альфакторных ЛСВ і ступені іх уключанасці ў працэс семантычнай дэрывацыі;

- вызначэнне спецыфікі міжмоўнага карэспандавання (суадносіны эквівалентнасці, частковага супадзення і безэквівалентнасці) другасных альфакторных ЛСВ у беларускай і англійскай мовах.

Навуковы кіраўнік
доктар філалагічных навук,
прафесар В. Д. Старычонак

Старычонка В.Д
Намеснік начальніка АК БДПУ
С. Б. Лысенко
31. 01. 2023

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
УСТАНОВА АДУКАЦЫІ «БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ ІМЯ МАКСІМА ТАНКА»